**ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!**

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 10 (640) | Субота, 22 сакавіка 1986 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

**19-ГА КРАСАВІКА — УСЕСАЮЗНЫ КАМУНІСТЫЧНЫ СУБОТНІК, ПРЫСВЕЧАНЫ 116-Й ГАДАВІНЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ У. І. ЛЕНІНА. СВЯТУ ПРАЦЫ — СТАРАННУЮ ПАДРЫХТОЎКУ І АКТЫЎНЫ УДЗЕЛ УСЯГО КАЛЕКТЫВУ ГДУ!**

## На гадавым сходзе АН СССР

Рашучы паварот да работы па-новаму на ўсім фронце навуковых даследаванняў — такі галоўны матыў выступленняў вядучых вучоных краіны на гадавым агульным сходзе АН СССР, дзе прайшло абмеркаванне задач савецкай навукі па выкананню рашэнняў XXVII з'езда КПСС.

Вучоныя, якія выступілі на агульным сходзе, выказвалі свае прапановы аб шляхах паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, павышэння эфектыўнасці даследаванняў, удасканаленні механізма ўкаранення распрацовак у практыку.

**РАШЭННІ XXVII З'ЕЗДА КПСС — У ЖЫЦЦЁ!**

# ФОРМУЛА ЎДАСКАНАЛЕННЯ І РОСТУ

**— З даклада рэктара акадэміка АН БССР Б. В. БОКУЦЯ на навукова-метадычнай канферэнцыі прафесарска-выкладчыцкага саставу ГДУ —**

Для вышэйшай школы краіны, зазначыў у пачатку свайго даклада Б. В. Бокуць, наступіў якасна новы этап. Яна знаходзіцца на шляху карэннай перабудовы. Гэта вынікае з матэрыялаў нарады ў ЦК КПСС па паскарэнню навукова-тэхнічнага прагрэсу, красавіцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС і асабліва з рашэнняў XXVII з'езда КПСС.

У Палітычным дакладзе Цэнтральнага Камітэта КПСС партыйнаму з'езду таварыш М. С. Гарбачоў сказаў: «Партыя ставіць задачу перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. У апошнія гады рост выпуску спецыялістаў не суправаджаўся належным павышэннем якасці іх падрыхтоўкі. Сур'ёзна адстала матэрыяльная база вышэйшай школы. Мае патрэбу ў значным паляпшэнні практыка выкарыстання інжынерна-тэхнічных кадраў.

Цяпер падрыхтаваны прапановы, накіраваныя на тое, каб змяніць існуючае становішча. Інтарэсы грамадства патрабуюць павышэння прэстыжнасці інжынернай працы. Трэба будзе перагледзець структуру вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, забяспечыць падрыхтоўку спецыялістаў на сучасным узроўні, валодаючых грунтоўнымі тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі. Па-новаму, відаць, трэба будаваць узаемаадносіны вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школы з галінамі народнай гаспадаркі, узмацніць іх узаемную зацікаўленасць у павышэнні ўзроўню навучання і перападрыхтоўкі кадраў, кардынальным паляпшэнні іх выкарыстання на вытворчасці».

У цяперашні час, падкрэсліў дакладчык, паўсталі, па крайняй меры, дзве дастаткова складаныя задачы. Па-першае, забяспечыць апераджаючае нават у праяўленні з тэхнічнай рэканструкцыяй народнай гаспадаркі, развіццё сярэдняй і вышэйшай школы. Па-другое, перабудаваць дзяржаўную сістэму перападрыхтоўкі і няспыннага прафесіянальнага росту кадраў.

У краіне пачалася работа па перабудове вышэйшай школы. Яе сэнс — узмацніць агульнанавуковую і прафесіянальную падрыхтоўку спецыялістаў. Ужо сёння можна сказаць, што ў аснову гэтай работы будзе пакладзена інтэграцыя адукацыі, вытворчасці і навукі. З гэтай мэтай прапануецца весці падрыхтоўку спецыялістаў па заказах галін народнай гаспадаркі, будаваць адносіны паміж імі і ВНУ на базе дагавораў, шырэй прыцягваць вядучых вучоных — арганізатараў вытворчасці да падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі спецыялістаў, не ставіць выкладчыкаў ВНУ ў залежнасць ад адсеву студэнтаў, але ўздымаць іх адказнасць за навучанне і выхаванне студэнцкай моладзі. Далей дакладчык гаварыў аб некаторых мяркуемых аспектах перабудовы сістэмы вышэйшай школы. Вышэйшая школа — гэта важная частка ўсёй кадравай палітыкі. Натуральна, што яе перабудова павінна адбывацца ў цеснай сувязі з рашэннем эканамічных, сацыяльных і арганізацыйна-упраўленчых праблем.

Адсюль мы павінны зрабіць вывады і для сябе. Мы ўсе добра ведаем, што за апошняе дзесяцігоддзе вышэйшая школа развівалася, калі можна так сказаць, ушырыню, а не ўглыбіню. Стала моцна адставаць матэрыяльная база вышэйшай адукацыі. Спашлюся на такія лічбы. У нашай краіне ў сістэме Мінвуза СССР у сярэднім на аднаго студэнта прыходзіцца навуковага і вучэбнага абсталявання на 4 тыс. руб. У нашым універсітэце гэта лічба роўна прыкладна 900 руб. Значыць, наша матэрыяльная база яшчэ даволі слабая. Праўда, у нас ёсць і некаторыя асаблівасці. Скажам, філолагі, гісторыкі не патрабуюць такога абсталявання, як хімікі, фізікі і іншыя спецыяльнасці. Аднак нашу матэрыяльную базу ўсё роўна трэба ўсямерна ўзмацняць.

Далей Б. В. Бокуць падзяліўся ўражаннямі ад наведвання Куйбышаўскага авіяцыйнага інстытута, дзе ён вывучаў сістэму мэтавай інтэнсіўнай падрытоўкі спецыялістаў, якая знаходзіць у краіне ўсё больш шырокае распаўсюджанне.

Усім зразумела, што мы таксама павінны цяпер па-новаму будаваць свае адносіны з галінамі народнай гаспадаркі. Неабходна, на мой погляд, ствараць не толькі сістэму «ВНУ — галіна», як мы гэта робім, але і ісці далей. Маецца на ўвазе менавіта сістэма мэтавай інтэнсіўнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Добрыя сувязі і кантакты ў нас наладжаны з Міністэрствам радыёпрамысловасці СССР. Створана вучэбна-навукова-вытворчае аб'яднанне, на прадпрыемствах гэтай галіны адкрыты філіялы кафедр фізічнага факультэта Работу ў гэтым напрамку трэба пашыраць і актывізоўваць яшчэ больш. Гэта аказвае істотны ўплыў на падрыхтоўку добрых спецыялістаў. Вельмі важна, што на іх ёсць штогод стабільныя заяўкі.

Трэба сказаць аб тым, што Міністэрства радыёпрамысловасці СССР аснашчае лабараторыі нашага універсітэта прыборамі, вылічальнай тэхнікай, іншым каштоўным абсталяваннем, што дазваляе павышаць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў. Гэта ж дало магчымасць адкрыць навукова-даследчую лабараторыю і тры дысплейныя класы, дзе ўжо з першага курса студэнты пачынаюць авалодваць інфарматыкай і вылічальнай тэхнікай.

На аснове заключанага дагавора Мінрадыёпрам СССР выдзеліў універсітэту сродкі для пачатку будаўніцтва новага вучэбна-лабараторнага корпуса фізічнага факультэта.

Фізічны факультэт і яго кафедры завязваюць узаемавыгадныя сувязі і з іншымі міністэрствамі, што служыць добрым прыкладам.

Многае зроблена ў гэтым напрамку і на геалагічным факультэце. Ёсць вучэбна-вытворчае аб'яднанне, створана і дзейнічае галіновая навукова-даследчая лабараторыя «Мінеральна-сыравінныя рэсурсы Беларусі», з новага навучальнага года адкрываецца новая спецыяльнасць «Геафізічныя метады пошукаў і разведкі месцанараджэнняў карысных выкапняў». Міністэрства геалогіі СССР таксама выдзеліла універсітэту сродкі на будаўніцтва вучэбнага корпуса фізічнага факультэта.

Геалагічнаму факультэту цяпер неабходна папрацаваць у тым напрамку, каб вызначыць добрых заказчыкаў на сваіх спецыялістаў.

Калектыву біялагічнага факультэта неабходна наладзіць цесныя кантакты з рэспубліканскім аграпромам. Па ўзгадненню мы павінны рыхтаваць 25 чалавек для работы на комплексах па кормавытворчасці рэспублікі. На мой погляд, біяфаку таксама патрэбна стварыць вучэбна-навукова-вытворчае аб'яднанне і галіновую лабараторыю, падумаць аб пачатку падрыхтоўкі, і хутчэй за ўсё, перападрыхтоўкі спецыялістаў гэтага профілю.

Эканамічнаму факультэту настаў час, нарэшце, знайсці трывалы «рынак збыту» спецыялістаў і наладзіць цесныя адносіны з адпаведнымі галінамі. Неабходна ўсебакова абгрунтаваць і пачаць падрыхтоўку спецыялістаў па эканоміцы працы для сельскай гаспадаркі. Яны крайне неабходны.

Нам таксама трэба падлічыць, якім чынам павялічыць падрыхтоўку спецыялістаў па арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі. Тут ёсць два шляхі. Першы — адкрыццё вячэрняй формы навучання, таму што на вылічальных цэнтрах і ўчастках працуе, як ужо падлічана, больш 80% неспецыялістаў; другі — падрыхтоўка і перападрыхтоўка па цыклах дысцыплін або асобных дысцыплінах асоб, якія маюць вышэйшую адукацыю, але працуюць не па спецыяльнасці.

Думаецца, што неабходна на цвёрдыя дагаворныя асновы пераводзіць падрыхтоўку і нашых педагагічных кадраў. Трэба заключыць трывалыя дагаворы з абласнымі аддзеламі народнай адукацыі Гомельскай і Магілёўскай абласцей.

Абавязкова трэба будзе прадугледжваць пры гэтым адкрыццё галіновых або навукова-вытворча-даследчых лабараторый.

Перабудова вышэйшай школы, сказаў у заключэнне Б. В. Бокуць, закране практычна ўсе бакі нашай дзейнасці,, пачынаючы ад набору студэнтаў і заканчваючы выпускам спецыялістаў. Наш пачэсны абавязак — паспяхова справіцца з усімі пастаўленымі задачамі.

*У парткоме*

## ПАВЫШАЦЬ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ РАБОТЫ

У мінулую сераду на чарговым пасяджэнні партыйнага камітэта разгледжана пытанне «Аб рабоце дэканата, партыйнай, прафсаюзных і камсамольскай арганізацый фізічнага факультэта па выкананню пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па пераадоленню п'янства і алкагалізму». Заслуханы справаздачы дэкана факультэта У. М. Старыкава і сакратара партбюро Т. П. Жалонкінай. Ім, а таксама сакратару камсамольскай арганізацыі В. Пракапенку і старшыні студэнцкага прафбюро Л. Гуляковай было зададзена шмат пытанняў, якія датычыліся паляпшэння ўсёй ідэйна-выхаваўчай работы.

Ад камісіі, рыхтаваўшай пытанне на абмеркаванне партыйным камітэтам, выступіў намеснік сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце І. В. Нямкевіч.

На пасяджэнні выступілі дацэнт фізічнага факультэта член парткома А. П. Грыбайла, сакратар камітэта ЛКСМБ В. А. Асіпенка, прарэктар па вучэбнай рабоце Л. А. Шамяткоў, рэктар універсітэта Б. В. Бокуць, сакратар парткома М. І. Старавойтаў. Адзначана, што на фізічным факультэце за апошні час праведзена некаторая работа па выкананню пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па пераадоленню п'янства і алкагалізму», аднак яна яшчэ крайне недастатковая і малаэфектыўная. Прынятая на пасяджэнні парткома пастанова накіравана на ўхіленне меўшых месца ў гэтай справе недахопаў. Яе змест будзе апублікаваны ў наступным нумары нашай газеты.

## АБ КУРСЕ ДЗЕЯННЯЎ

На гэтым тыдні ў аўторак адбыўся пастаянна дзеючы семінар сакратароў партыйных бюро. Абмеркавана пытанне аб задачах факультэцкіх партарганізацый універсітэта па выкананню рашэнняў XXVII з'езда КПСС і XXX з'езда Кампартыі Беларусі. Заслухана інструкцыйнае выступленне загадчыцы аддзела прапаганды і агітацыі Цэнтральнага РК КПБ Т. Ф. Любезнай.

На семінары выступіў сакратар парткома ГДУ М. І. Старавойтаў. Па абмяркоўваемаму пытанню сакратары партыйных бюро абмяняліся думкамі.

# ПАЛІТЫЧНЫ ЗАЛІК

З 1983 года ў нашым універсітэце рэгулярна праводзіцца палітычны залік, які ставіць мэтай пашырэнне палітычнага кругагляду студэнцтва. Адметнай асаблівасцю палітзаліку сёлетняга года (а ён пачнецца ва універсітэце 24 сакавіка і завершыцца 1-га красавіка) з'яўляецца тое, што ён праходзіць пасля заканчэння работы XXVII з'езда КПСС. У першую чаргу ў праграму палітычнага заліку ўваходзяць пытанні, якія дапамагаюць вызначыць, наколькі глыбока і правільна студэнты разумеюць мэты і задачы, пастаўленыя з'ездам перад нашай краінай у галіне сацыяльна-эканамічнага развіцця, на міжнароднай арэне, ролю Ленінскага камсамола ў далейшым удасканальванні сацыялістычнага грамадства, барацьбе за мір. Асаблівая ўвага ў ходзе палітычнага заліку павінна быць звернута на мірныя ініцыятывы Савецкага Саюза, прапанаваныя ў апошні час.

Задача выкладчыкаў кафедр грамадскіх навук, якія ўваходзяць у састаў камісій,— забяспечыць метадычнае кіраўніцтва ў складанні праграмы палітзаліку, правесці кансультацыі ў камсамольскіх групах перад залікам.

Па выніках субяседвання камісія (яе састаў той жа, што і на Ленінскім заліку) выстаўляе ў асабісты комплексны план камсамольца адну з трох адзнак: «нездавальняюча», «здавальняюча», «добра».

Вынікі здачы палітзаліку ўлічваюцца ў ходзе грамадска-палітычнай атэстацыі па Ленінскаму заліку.

**МАТЭРЫЯЛЫ ДА ПАЛІТЗАЛІКУ:**

— Кастрычніцкі (1985 г.) Пленум ЦК КПСС.
— Палітычны даклад ЦК КПСС XXVII з'езду партыі.
— Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года.
— Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Новая рэдакцыя.
— Статут КПСС.
— Выступленне на XXVII з'ездзе КПСС першага сакратара ЦК ВЛКСМ В. М. Мішына.
— Заява Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова ад 15 студзеня 1986 г.
— Адказы М. С. Гарбачова на пытанні газеты «Юманітэ».
— Адказ Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова на сумеснае пасланне лідэраў Аргенціны, Індыі, Мексікі, Танзаніі, Швецыі і Грэцыі.

**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА ГДУ.**

*Ажыццявім планы партыі*

# У НАВУКУ — ДАСТОЙНЫ ЎКЛАД МАЛАДЫХ

Асноўныя напрамкі работы Савета маладых вучоных і спецыялістаў (СМВ і С) нашага універсітэта даволі разнастайныя і ўвязаны са спецыфікай кожнага факультэта. Сярод асноўных напрамкаў работы варта назваць наступныя: прыцягненне ўсё большай колькасці маладых спецыялістаў у навуковую дзейнасць; павышэнне эфектыўнасці даследчых работ; паляпшэнне якасці выкладання, удасканальванне метадычных і лабараторных матэрыялаў і інш. З гэтай мэтай СМВ і С садзейнічае і кантралюе рост навуковай кваліфікацыі маладых вучоных (праз удзел у навуковых канферэнцыях, у агульнауніверсітэцкіх, факультэцкіх і кафедральных тэматычных навуковых семінарах, у школах маладых вучоных і г. д.), паскарае ўкараненне іх навуковых распрацовак у вытворчасць і вучэбны працэс.

Ва універсітэце цяпер налічваецца звыш 150 маладых вучоных і спецыялістаў. Для павышэння эфектыўнасці іх навукова-даследчай работы штогод праводзіцца агляд-конкурс на лепшую апублікаваную работу. Летась ён прысвячаўся 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Крытэрый вызначэння пераможцаў уключаў як колькасць апублікаваных работ, так і актуальнасць, глыбіню праведзеных даследаванняў. Па выніках агляду-конкурсу ўзнагароджана 11 чалавек.

Арганізацыя навуковых канферэнцый і далучэнне маладых вучоных да ўдзелу ва Усесаюзных школах маладых вучоных садзейнічае павышэнню іх кваліфікацыі і эфектыўнасці працы.

Устаноўлены і падтрымліваюцца больш цесныя сувязі ў сістэме «ГДУ — вытворчасць». Саветам факультэтаў даручана ўзмацніць кантроль і рэальную дапамогу ў вырашэнні гэтай задачы. Тэматыка сувязей выбіралася ў адпаведнасці з профілем работы кожнага факультэта, а ўнутры іх — кожнай кафедры. Так, маладыя вучоныя біялагічнага факультэта актыўна ўдзельнічаюць у рабоце ВНВА «Фауна Палесся», выступаюць з дакладамі на яго канферэнцыях, рыхтуюць да друку тэзісы дакладаў IV абласной падагульняючай навуковай канферэнцыі «Жывёльны свет Беларускага Палесся, ахова і рацыянальнае выкарыстанне».

Маладыя вучоныя біяфака ўносяць свой уклад у распрацоўку вучэбных праграм для мікракалькулятара «Электроніка-БЗ-21». Яны з'явіліся ініцыятарамі ўпершыню створанага навукова-даследчага студэнцкага атрада, які па выніках работы заняў другое месца ў рэспубліцы. Маладыя вучоныя названага факультэта выступілі з 3 дакладамі на міжнародных і ўсесаюзных канферэнцыях.

За апошні час актывізавалі сваю работу і маладыя вучоныя геалагічнага факультэта. Яны выявілі значнае забруджванне паверхневых вод Гомельскім хімзаводам; разлічылі эксплуатацыйныя запасы падземных вод участкаў Буда-Кашалёва, Лунінец, Каранёўка метадам матэматычнага мадэліравання; зроблена ацэнка велічыні страт сцёку малых рэк. Вынікі, даследаванняў адпраўлены ў Дзяржаўную камісію па запасах і атрымалі адзнаку «добра». Даследаваліся таксама рудаосныя габроіды Беларускага масіву і жалезістыя кварцыты Акалоўскага жалезаруднага месцанараджэння (Мінская вобласць). Атрыманы новыя даныя аб пярвічным паходжанні рудаосных парод, аб крыніцах руднага рэчыва. Дадзены рэкамендацыі аб перспектывах пошуку і разведкі жалезных руд у Беларусі. Сфармуляваныя палажэнні былі апублікаваны ў дакладах Акадэміі навук БССР.

Маладыя вучоныя і спецыялісты эканамічнага факультэта працуюць па трох гаспдагаворных і пяці дзяржбюджэтных тэмах, а таксама па дагаворах аб творчым супрацоўніцтве з прамысловымі прадпрыемствамі горада. На эканомфаку створаны педатрад на базе 3-га курса спецыяльнасці АМАЭІ, якім кіруе ад Савета маладых вучоных В. В. Клыга.

Маладыя вучоныя кафедры філасофіі і навуковага камунізму ўдзельнічалі ў сацыялагічным вывучэнні патрэб працоўных горада і вобласці.

Выкладчыкі ГДУ Н. Е. Цітова і Я. А. Броўкін сталі пераможцамі абласнога конкурсу на лепшую апублікаваную работу і выйшлі на рэспубліканскі тур конкурсу.

СМВ і С факультэтаў удзельнічаюць у рамках вучоных саветаў структурных падраздзяленняў у атэстацыі маладых вучоных пры выбранні і перавыбранні на пасады. Рэгулярна абмяркоўваецца пытанне здачы імі кандыдацкіх экзаменаў. Маладыя вучоныя кафедр палітэканоміі, філасофіі і навуковага камунізму з'яўляюцца кіраўнікамі метадалагічных семінараў, выкладчыкамі універсітэта марксізму-ленінізму пры Гомельскім АК КПБ.

Вялікая работа праводзіцца і па лініі таварыства «Веды». Найбольш значны ўклад у лекцыйную прапаганду ўносяць маладыя вучоныя грамадскіх кафедр і гуманітарных факультэтаў.

Саветы маладых вучоных універсітэта і факультэтаў значную ўвагу ўдзяляюць развіццю навукова-тэхнічнай творчасці моладзі. На біялагічным факультэце і факультэце фізвыхавання яны актыўна прапагандуюць біялагічныя веды, пытанні аховы прыроды, развіцця фізкультуры і спорту сярод моладзі, насельніцтва горада і вобласці. Маладыя вучоныя кіруюць школамі «Юны фізіёлаг», «Юны біёлаг», дзе займаецца каля 100 школьнікаў.

На матэматычным факультэце пад апекай маладых — Усесаюзная завочная матэматычная школа, школы «Юны праграміст» і «Юны матэматык». Яны прымаюць удзел у арганізацыі і правядзенні алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс».

На гісторыка-філалагічным факультэце працуе школа «Юны гісторык». Пад кіраўніцтвам 5 маладых вучоных студэнты рыхтуюць навуковыя работы на конкурс.

У мэтах ліквідацыі камп'ютэрнай непісьменнасці вядзецца падрыхтоўка да рэалізацыі агульнасаюзнай праграмы развіцця вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм кіравання. Сумесна з Саветам маладых вучоных і спецыялістаў пры Гомельскім абкоме камсамола распрацаваны план, які ўключае шырокія меры дапамогі школе ў новай для нас справе — навучанню школьнікаў асновам інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі. Маладыя вучоныя эканамічнага і матэматычнага факультэтаў арганізавалі кансультацыйныя пункты для настаўнікаў.

У Палітычным дакладзе ЦК КПСС XXVII з'езду нашай партыі дадзена ўражваючая, маштабная карціна сучаснага свету. Зроблены ўсебаковы аналіз стану савецкага грамадства, яго поспехаў і цяжкасцей, выказана ўпэўненасць у новых дасягненнях справы сацыялізму і камунізму. У паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны свой пасільны ўклад унясуць маладыя вучоныя і спецыялісты ГДУ.

**У. БОБРЫК,**
**старшыня Савета маладых вучоных і спецыялістаў ГДУ, кандыдат эканамічных навук.**

НА НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

# У КУРАТАРА — АДКАЗНЫЯ АБАВЯЗКІ

**На мінулым тыдні ў нашым універсітэце праходзіла навукова-метадычная канферэнцыя прафесарска-выкладчыцкага саставу на тэму: «Удасканальванне самастойнай вучэбнай работы і ўмацаванне дысцыпліны студэнтаў». Цікава і карысна прайшло пасяджэнне секцыі куратараў.**

На секцыі абмяркоўвалася пытанне аб рабоце куратараў акадэмічных груп. Гэта адна з важнейшых форм ажыццяўлення адзінства вучэбнага і выхаваўчага працэсу. Куратар выступае ў ролі настаўніка, выхавацеля, арганізатара і непасрэднага выканаўцы многіх педагагічных спраў. Сумесна з актывам групы яму даводзіцца праводзіць са студэнтамі вялікую выхаваўчую работу, якая патрабуе пэўных ведаў і творчых здольнасцей. Асаблівасцю дзейнасці куратара з'яўляецца шырокая кантактнасць.

Аб рабоце куратара падрабязна гаварыў у сваім дакладзе старшыня секцыі, асістэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі, кандыдат педагагічных навук А. А. Лытко. Ён адзначыў, што працэс падрыхтоўкі спецыялістаў можа паспяхова ажыццяўляцца толькі праз сістэму калектыўных сувязей і адносін, бо, як адзначалі К. Маркс і Ф. Энгельс, «толькі ў калектыве індывід атрымлівае сродкі, якія даюць яму магчымасць усебаковага развіцця яго задаткаў».

А. А. Лытко адзначыў, што перад куратарамі стаіць задача велізарнай важнасці — стварыць у студэнцкай групе сапраўдны калектыў, што дазволіць выхоўваць кожнага студэнта з дапамогай і праз калектыў, гэта значыць выкарыстаць асноўны метад у сістэме камуністычнага выхавання.

У сваім выступленні дацэнт кафедры ўліку і статыстыкі І. К. Кекіш падзяліўся вопытам планавання і правядзення ў акадэмічнай групе ідэйна-выхаваўчай работы.

Аб рабоце куратараў на фізічным факультэце расказаў У. А. Пенязь. Ён спыніўся на тых метадах работы, якія садзейнічаюць развіццю ў студэнтаў цікавасці да вучобы, выбранай прафесіі, гаварыў таксама аб арганізацыі адпачынку студэнтаў.

Змястоўным было выступленне асістэнта кафедры беларускай літаратуры В. С. Генаш. Яна расказала аб сваёй рабоце куратара на 3 курсе беларускага аддзялення. Нядаўна была арганізавана паездка будучых філолагаў на радзіму народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа. Тут студэнты пазнаёміліся з музеем пісьменніка, выступілі з канцэртам. Пастаянная, мэтанакіраваная работа з групай у пазавучэбны час садзейнічае паляпшэнню паспяховасці студэнтаў. Асноўная частка іх займаецца на «добра» і «выдатна».

Выкладчыца кафедры англійскай мовы Л. Р. Багамаз у сваім выступленні звярнула ўвагу на дзейнасць куратара па фарміраванню асобы студэнта як будучага спецыяліста. Намаганні куратара перш за ўсё павінны быць накіраваны на развіццё ў моладзі цікавасці да выбранай прафесіі. З гэтай мэтай на эканамічным факультэце праводзяцца тэматычныя дыспуты, вечары.

Асістэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі І. У. Сільчанка сваё выступленне прысвяціла пытанню міжасабовых адносін у акадэмічнай групе. Яго вывучэнне праводзіцца на базе нашага універсітэта.

Работа секцыі куратараў прайшла ў дзелавой абстаноўцы. Усе прысутныя праявілі высокую актыўнасць, задавалі дакладчыкам шмат пытанняў.

Супрацоўнікі даведніцка-бібліяграфічнага аддзела бібліятэкі універсітэта арганізавалі выстаўку «У дапамогу куратару па камуністычнаму выхаванню студэнцкай моладзі». На ёй была шырока прадстаўлена ўся неабходная для куратараў літаратура, а таксама матэрыялы па пытаннях камуністычнага, эстэтычнага, атэістычнага выхавання ў студэнцкай групе, выдадзеныя НДІ праблем вышэйшай школы. Супрацоўнікі аддзела зрабілі агляд літаратуры аб рабоце куратараў акадэмічных груп, частка якой раздадзена для больш глыбокага азнаямлення і вывучэння з мэтай далейшага прымянення на практыцы ўсяго новага і перадавога.

**Н. ГУРЭВІЧ,**
**загадчыца даведніцка-бібліяграфічнага аддзела бібліятэкі ГДУ.**

*НА ДНЯХ ФАКУЛЬТЭТА*

# СВЯТА ФІЛОЛАГАЎ І ГІСТОРЫКАЎ

Штогод на гістфіле месяц сакавік чакаюць з асаблівым нецярпеннем і нават хваляваннем. Па добрай традыцыі ў першы месяц вясны сюды прыходзіць вясёлае студэнцкае свята — Дні гістфіла. Задоўга да пачатку пачынаюць падрыхтоўку да іх будучыя філолагі і гісторыкі.

Не паспелі яшчэ ўлегціся ўражанні ўсіх удзельнікаў традыцыйных дзён і іх гасцей ад сёлетняга свята — ДІФ-86.

Па традыцыі на ўрачыстым адкрыцці «Дзён гістфіла» выступілі дэкан факультэта М. Ф. Гуліцкі і сакратар камітэта камсамола Юрый Пенязь. Праграма наступнага дня, аўторка, прадугледжвала сустрэчы студэнтаў са старшакласнікамі школ г. Гомеля з мэтай правядзення прафарыентацыйнай работы. Вучні СШ №№ 8, 11, 16, 27 прыйшлі на факультэт, каб падрабязна пазнаёміцца з яго кабінетамі, выкладчыкамі. Народны універсітэт маральна-эстэтычнага выхавання арганізаваў таксама сустрэчу студэнтаў-гісторыкаў 4-га курса з дзевяцікласнікамі Рэчкаўскай сярэдняй школы Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. 30 вучняў прыехалі ў ГДУ з дырэктарам гэтай школы, выпускніком гістфіла 1983 года В. В. Пякарскім. Ім вельмі цікава было пазнаёміцца з ГДУ, традыцыямі гістфіла, факультэтамі народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання. Аб гэтым ім расказала чацвёртакурсніца гістфіла, член савета народнага універсітэта Алена Шчома.

Насычанымі былі наступныя дні свята. Іх гаспадары і госці сустрэліся з удзельнікамі гарадскога клуба самадзейнай песні, артыстам кіно С. Садальскім, правялі шмат вясёлых мінут на вечары гумару ў студэнцкім кафэ. Адбыліся таксама справаздачны канцэрт удзельнікаў мастацкай самадзейнасці факультэта, спартыўныя спаборніцтвы і іншыя цікавыя мерапрыемствы.

(Наш. кар).




НА ЗДЫМКАХ: Выпускнік гістфіла В. Пякарскі. Чацвёртакурсніца Алена Шчома расказвае вучням Рэчкаўскай СШ Івацэвіцкага раёна пра ГДУ.

Фота Н. КІР'ЯНАВАЙ.





# У ГАСЦЯХ—АРТЫСТ КІНО



**Даволі частымі гасцямі ў нашым універсітэце сталі вядомыя артысты тэатра і кіно. Творчыя сустрэчы з імі дапамагаюць нам, аматарам мастацтва, лепш зразумець і спасцігнуць духоўны свет акцёраў.**

**На чарговай сустрэчы, якая адбылася ў мінулую пятніцу, перад выкладчыкамі, студэнтамі і супрацоўнікамі ГДУ выступаў Станіслаў Садальскі. Нам памятны яго ролі ў фільмах «Белыя росы», «За беднага гусара замоўце слова», «Месца сустрэчы змяніць нельга» і інш. Акцёр расказаў пра свой шлях на тэатральную сцэну і кіно, падзяліўся творчымі планамі.**

**НА ЗДЫМКУ: Станіслаў Садальскі.**

**Фота Н. Кір'янавай.**

●

## КАНЦЭРТ СТАРАДАЎНЯЙ МУЗЫКІ



Кіеўскі камерны ансамбль старадаўняй музыкі «Гармонія» — калектыў, які добра вядомы ў нашай краіне і за рубяжом. Усюды яго гастролі праходзяць з вялікім поспехам. Заслужанае прызнанне ён заваяваў сваёй папулярызацыяй старадаўняй музыкі. У саставе «Гармоніі» — вядучыя салісты Кіеўскай філармоніі, лаўрэаты міжнародных конкурсаў.

Галоўны выканаўчы прынцып калектыву — раскрыццё выразнага багацця разнастайных ансамблевых спалучэнняў інструментаў. Удзельнікі ансамбля выступаюць як салісты ў саставе дуэта, трыо, квартэта або аб'ядноўваюцца ў адзіны вялікі ансамбль. Гэта дазваляе пазнаёміць слухачоў з рознымі жанрамі і формамі камернай музыкі, раскрыць магчымасці гэтай багацейшай галіны музычнай творчасці.

Днямі праслаўлены калектыў выступаў на сцэне актавай залы нашага універсітэта. У выкананні камернага ансамбля прагучалі забытыя або рэдка выконваемыя ўзоры народнай музычнай творчасці і сачыненні старадаўніх кампазітараў.

**(Наш кар.).**

*Мы—інтэрнацыяналісты*

# ДРУЖБЕ МАЦНЕЦЬ!

**У інтэрнаце № 2 па вуліцы Кірава на мінулым тыдні адбыўся вечар інтэрнацыянальнай дружбы з удзелам замежных студэнтаў, якія навучаюцца на матэматычным факультэце нашага універсітэта.** Дзень для правядзення гэтага мерапрыемства быў выбраны не выпадкова — 12 сакавіка народ Маўрыкія адзначыў 18-ю гадавіну сваёй незалежнасці. Маўрыкій — астраўная дзяржава ў заходняй частцы Індыйскага акіяна — доўгія часы быў калоніяй Францыі, а затым Англіі. Пасля абвяшчэння незалежнасці Маўрыкій, з якім Савецкі Саюз адным з першых устанавіў дыпламатычныя адносіны, праводзіць міралюбівую знешнюю палітыку, падтрымлівае нацыянальна-вызваленчы рух, актыўна садзейнічае міжнароднаму супрацоўніцтву. Гэта — радзіма двух замежных студэнтаў нашага універсітэта—Віны Матуры і Анджая Джуці. Віна і Анджай скончылі I семестр з адзнакамі «добра» і «выдатна», яны, як і іншыя замежныя студэнты, актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці, праяўляюць жывы інтарэс да нашай краіны, да жыцця савецкай моладзі.

...У святочна ўпрыгожаным памяшканні сталовай інтэрната Віну Матуру і Анджая Джуці, іншых замежных студэнтаў шчыра віталі гаспадары ўрачыстасці — студэнты матэматычнага факультэта, якія паднеслі гасцям хлеб-соль. З віншаваннем да маўрыкінскіх студэнтаў звярнуліся дэкан па рабоце з замежнымі навучэнцамі У. А. Сізоненка, старшы куратар інтэрната А. Ф. Каморнікаў, а таксама прысутнічаўшыя на вечары сакратар гаркома камсамола Л. В. Лісюк і рэферэнт БММТ «Спадарожнік» С. М. Саўпель. З хваляваннем і гордасцю за сваю радзіму Віна і Анджай расказалі прысутным аб гісторыі, дзяржаўным ладзе, эканоміцы і культуры Маўрыкія. Бурныя, працяглыя апладысменты выклікалі словы, якімі Віна Матура скончыла сваё выступленне: «Няхай жыве Маўрыкій! Няхай жыве Савецкі Саюз! Няхай жыве мір і дружба паміж народамі!» Затым Віна выканала песню, а Анджай прачытаў верш, якія былі прысвечаны іх радзіме—Маўрыкію. Сваіх таварышаў па вучобе павіншавалі Сайкалоджы Сукута (Зімбабве) і Фелікс Кафі (Бенін), якія таксама расказалі прысутным шмат цікавага аб сваіх краінах.

Студэнты-матэматыкі падрыхтавалі для замежных сяброў канцэрт мастацкай самадзейнасці: гучалі песні і вершы аб Радзіме, каханні, студэнцкім жыцці, аб дружбе і салідарнасці моладзі ўсіх краін. Шмат ініцыятывы, знаходлівасці праявілі ў перыяд падрыхтоўкі да вечара інтэрнацыянальнай дружбы студэнты-матэматыкі Г. Базылева, М. Вяроўкіна, Л. Шэлех, Л. Шаўцова, С. Ушакова. Дапамогу і дзейсную падтрымку аказала ім камендант інтэрната № 2 А. І. Саўчанка.

Карыснае, змястоўнае мерапрыемства праведзена студэнтамі матэматычнага факультэта. Няма сумнення ў тым, што вечары інтэрнацыянальнай дружбы стануць трывалай традыцыяй у нашым універсітэце.

**У. КОВАЛЬ,**
**нам. дэкана па рабоце з замежнымі навучэнцамі, дацэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства.**



На здымку: выступаюць студэнты з Маўрыкія Віна Матура і Анджай Джуці.

Фота **С. Кукла.**

# У ГАСЦІНАЙ—ЦІКАВА

**У студэнцкім інтэрнаце № 1 на базе факультэта «Чалавек і кніга» народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання адкрылася «Тэатральная гасціная».**

Гаспадары «Тэатральнай гасцінай», студэнты фізічнага факультэта, слухачы факультэта «Чалавек і кніга» прымалі першага госця. Ім стаў акцёр Гомельскага абласнога драматычнага тэатра, лаўрэат рэспубліканскага конкурсу чытальнікаў Аляксандр Лаўрыновіч. Ён пазнаёміў студэнтаў з літаратурнай праграмай «Вобраз жанчыны-маці ў савецкай паэзіі», якая складзена з вершаў вядомых паэтаў: С. Ясеніна, Р. Раждзественскага, Р. Гамзатава і У. Цыбіна. Яна з'яўляецца часткай кампазіцыі «Беражыце маці», падрыхтаванай А. Лаўрыновічам. Акцёр данёс да слухачоў высока паэтычны вобраз маці, гармонію пачуцця і слова, думкі і вобраза.

Аляксандр Лаўрыновіч расказаў таксама аб творчых планах акцёраў тэатра, аб яго новай прэм'еры — спектаклі «Мачыха», адказным для творчага калектыву экзамене — удзеле іх спектакля «Вокны» па п'есе гомельскага драматурга В. Ткачова ў рэспубліканскім конкурсе спектакляў, які адбудзецца ў маі.

У канцы сустрэчы гаспадары гасцінай Валянціна Баран і Марына Цвейфель прачыталі вершы любімых паэтаў Ю. Друнінай, Я. Еўтушэнкі, Р. Раждзественскага, а Міхаіл Букатаў і Ірына Каралёва выканалі песні пад акампанемент гітары.

Тэатральная гасціная пачала сваю работу. Поспехаў ёй!

**Л. АНТРОПАВА,**
**дацэнт кафедры агульнай фізікі,**
**дэкан факультэта «Чалавек і кніга», І. ЛІБА, студэнт гр. Ф-26.**

# РАДАСЦЬ ЗНАЁМСТВА

Ля ўваходу на выстаўку «Жаночы вобраз у выяўленчым мастацтве» са збору рэпрадукцый карцін асістэнта кафедры тэарэтычнай фізікі В. Я. Кусочкіна, якая адкрыта ў галоўным корпусе ўжо трэці тыдзень, на стале ляжыць кніга водзываў. Шмат яе старонак запоўнена запісамі наведвальнікаў. А іх тут пабывала нямала: студэнтаў і выкладчыкаў, супрацоўнікаў ГДУ, настаўнікаў і школьнікаў горада. Толькі самыя цёплыя, сардэчныя словы ў адрас арганізатараў выстаўкі запісаны ў гэтай кнізе. Вось некаторыя з іх: «...Гэта — куточак цудоўнага! Гэта — творчасць у сценах ВНУ! Гэта — школа выхавання: працаваць для калектыву дзеля ўзвышаных і высокамаральных матываў у жыцці... Няхай ніхто не пройдзе міма! Прыгажосць і гармонія неабходны як паветра здароваму ствараючаму розуму! (Т. Мальгіна, кандыдат эканамічных навук); «Дзякуй арганізатарам выстаўкі не толькі за сустрэчу з цудоўным, з талентам, а і за тое, што яны дапамаглі зразумець, што цудоўнае — вакол нас; тыя ж жанчыны, добрыя і мілыя, не толькі на карцінах. Азірніцеся, паглядзіце адзін на аднаго і на сябе больш уважліва, людзі!» (студэнты гр. Г-21 геафака).



НА ЗДЫМКУ: наведвальнікі выстаўкі знаёмяцца з прадстаўленымі на ёй рэпрадукцыямі карцін.

Фота Н. Кір'янавай.

*Цвярозасць—норма жыцця*

# НЯМА СПУСКУ

Кожная сумная гісторыя ў жыцці чалавека, асабліва маладога, павінна быць суровым урокам. Маецца на ўвазе, калі ва ўсім вінаваты сам. У прыватнасці, размова ідзе пра Сяргея Недзяка. Па заканчэнні школы ён вучыўся на фізічным факультэце ГДУ. Здолеў закончыць толькі адзін курс. Далейшая вучоба была спынена па ўласнай віне. Юнак пацягнуўся да чаркі, якая двойчы прывяла яго ў органы міліцыі. За непрыстойны ўчынак Сяргей быў выключаны з універсітэта.

Год працаваў на вытворчасці. Заслужыў станоўчую характарыстыку-рэкамендацыю для таго, каб зноў быць залічаным у састаў студэнтаў. Здавалася, для Сяргея хапіла часу, каб добра падумаць над сваімі паводзінамі і больш не дапускаць памылак у жыцці. На жаль, першы урок яму не пайшоў на карысць. Не адвык ён ад дрэннай прывычкі. Па-ранейшаму цягнуўся да моцных напіткаў. Знайшоўся і сабутэльнік. Ім стаў аднакурснік Андрэй Белавусаў. Дружбакоў аднойчы даставілі ў медвыцвярэзнік. І Сяргей і Андрэй хутка асэнсавалі становішча, у якое трапілі. Каб пазбегнуць заслужанага пакарання, імкнуліся любым чынам выкруціцца. Не ўдалося!

Сяргей Недзяк выключан з членаў ВЛКСМ, а Андрэю Белавусаву аб'яўлена строгая вымова з занясеннем ва ўчотную камсамольскую картку. Абодва яны адлічаны з універсітэта. Іх напаткаў такі лёс як і нядаўняга трэцякурсніка эканамічнага факультэта Яўгена Баранава.

Статыстыка не з прыемных. Але няхай яна будзе напамінаннем кожнаму: ва універсітэце няма і не будзе спуску выпівохам.

*У рэдакцыйнай пошце — паэзія*

Алексей НИКОЛАЕНКО,
студент 5-го курса истфила.

## ПРИХОД ВЕСНЫ

Опять весна!
Знакомая такая...
Она, как прежде,
Только, чуть взрослей...
Неповторимая:
Небесная,
Земная.
И неподкупная...
И все-таки добрей!
Она пришла,
И сразу наступила,
Хрустальной, чистой,
Утренней росой.
Любви цветеньем
Все обожествила
И распахнулась
Всей своей красой.
Заплакала,
Немного загрустила...
И слезным соком
Истекла с небес.
И в каждом сердце
Чувство оживила,
Подснежниками награждая
Лес.

## ПРЕДЧУВСТВИЕ

Уходит в даль
Весь снежный этот путь...
Уйдет зима
С холодными ветрами.
Уйдет...
Не отыскать
И не вернуть
Мою любовь,
С рассветными глазами.
Такую белую и чистую,
Как снег,
Такую добрую
И облачную фею.
Ты для меня
Единственна навек,
В тебя одну,
Загадочную верю!
И в шумном плеске
Тающей воды
Вернет мне сказка
«Алые полотна».
И паруса
Знакомой доброты,
Своей мечты
Вдруг распахнут все окна.

*Да ўвагі абітурыентаў*

# ПЛЮС БАЛ ЗА ПРЫЗВАННЕ

## НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ Ў ВНУ

Зацверджаны новыя правілы прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны. Карэспандэнту «Праўды» у Мінвузе СССР паведамілі, што ў іх захаваны прынцып конкурснага адбору, які дазваляе прымаць найбольш падрыхтаваную моладзь. Новае заключаецца ў тым, што некалькі зменены самі крытэрыі адбору. Калі раней сума балаў, набраных на ўступных экзаменах, у большасці выпадкаў з'яўлялася адзіным паказчыкам, вызначаючым рашэнне аб прыёме, то цяпер да яе будуць дабаўляцца дадаткова балы, якія могуць быць налічаны паступаючым па выніках прафарыентацыйнага субяседвання. Такое субяседванне ўводзіцца для паступаючых на навучанне з адрывам ад вытворчасці і будзе праводзіцца спецыяльнай камісіяй, якая дзейнічае на правах экзаменацыйнай. Узначальвае яе на кожным факультэце дэкан, а ў састаў будуць уваходзіць загадчыкі прафілюючых кафедр, прафесары, прадстаўнікі партыйнай, камсамольскай і прафсаюзных арганізацый.

Мэта субяседвання — па-першае, дапамагчы падаўшаму заяву ў ВНУ ў выбары прафесіі, найбольш адпавядаючай яго схільнасцям і ўзроўню падрыхтоўкі. І па-другое, ацаніць яго поспехі ў прафесіянальна накіраванай працы і творчасці. Гэта ацэнка будзе адлюстроўвацца ў балах ад аднаго да трох (адсутнасць дадатковых балаў ніяк не абмяжоўвае права абітурыента паступаць на выбраную ім спецыяльнасць) і сумiравацца з набранымі на экзаменах.

Такім чынам, маладыя людзі, праявіўшыя сябе ў галіне выбранай прафесіі яшчэ да паступлення ў ВНУ, атрымаюць пэўныя перавагі. Размова ідзе, напрыклад, аб выпускніках сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў, якія адпрацавалі ўстаноўлены тэрмін і паступаюць на роднасныя спецыяльнасці; аб асобах, якія маюць больш чым двухгадовы стаж работы, асабліва па роднаснай іх будучай прафесіі спецыяльнасці; аб звольненых у запас ваеннаслужачых, аб маладых вынаходніках і рацыяналізатарах і наогул усіх тых, хто мае дасягненні ў тэхнічнай або іншай прафесіянальна накіраванай творчасці, закончыў спецыялізаваныя школы пры ВНУ, пераможцам усесаюзных, рэспубліканскіх, гарадскіх і вузаўскіх алімпіяд, прафесіянальных конкурсаў і г. д.

Уводзімая сістэма не з'яўляецца чымсьці прынцыпова новым, не выпрабаваным у вышэйшай школе. На працягу многіх гадоў экзамен на прафесіянальную прыгоднасць праводзіўся ў ВНУ мастацтва, а ў 1985 годзе быў паспяхова праведзены адпаведны эксперымент больш чым у 60 тэхнічных вышэйшых навучальных установах розных рэспублік.

Другое змяненне ў правілах цесна звязана з першым. Узрастанне ролі прафесіянальнай арыентацыі ў фарміраванні кантынгенту студэнтаў дазволіла зменшыць колькасць уступных экзаменаў. У адпаведнасці з новымі правіламі іх будзе тры, а не чатыры. Для ўсіх паступаючых праводзіцца экзамен па рускай мове (або мове, на якой вядзецца выкладанне) і літаратуры ў форме сачынення, а таксама ў залежнасці ад профілю ВНУ — па матэматыцы або грамадазнаўству, або біялогіі. Трэцяя дысцыпліна, па якой праводзіцца экзамен, устанаўліваецца ВНУ.

І яшчэ адно змяненне, якое датычыцца толькі ВНУ Масквы, Маскоўскай вобласці, Ленінграда. У гэтых навучальных установах у выглядзе эксперыменту прыём уступных экзаменаў будзе праводзіцца з 10 па 31 ліпеня (у астатнія ВНУ, як і раней, у жніўні). Гэта дазволіць тым, хто не вытрымаў уступных экзаменаў у цэнтральныя ВНУ, паспрабаваць свае сілы пры паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы іншых гарадоў.

(«Праўда» за 16 сакавіка 1986 г.)

**КНІГІ НАШЫХ ВУЧОНЫХ**

# ПА ЭКАНАМІЧНАЙ ТЭОРЫІ

XXVII з'езд КПСС удзяліў вялікую ўвагу якаснаму паляпшэнню падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Важнейшым напрамкам удасканальвання гэтай работы з'яўляецца падрыхтоўка фундаментальных падручнікаў, узбройваючых студэнтаў сучаснымі ведамі.

У гэтай сувязі невыпадкова велізарная цікавасць выклікана да выхаду ў свет другога выдання падручніка «Навуковая арганізацыя працы і тэхнічнае нарміраванне на нафтавых прадпрыемствах». У яго напісанне вялікі ўклад унёс заслужаны дзеяч навукі РСФСР і Башкірскай ССР доктар эканамічных навук, прафесар нашага універсітэта Віктар Елісеевіч Цішчанка. Гэта дваццаць першы падручнік і 43-я навуковая кніга таленавітага вучонага і буйнага арганізатара навукі.

Рэцэнзуемы падручнік складаецца з 17 раздзелаў, у якіх паслядоўна і сістэмна выкладаецца асноўны змест дысцыпліны. У ім грунтоўна разгледжаны важнейшыя прынцыпы, мэты і задачы навуковай арганізацыі працы. Добра паказаны спосабы і значэнне рацыяналізацыі вытворчых працэсаў і арганізацыі рабочых месц, паляпшэнне ўмоў працы, удасканальванне матэрыяльнага і маральнага стымулявання. Вялікую практычную цікавасць маюць раздзелы, прысвечаныя метадам і арганізацыі тэхнічнага нарміравання працы. Асаблівая ўвага ўдзелена аналізу і перагляду працоўных норм, падрыхтоўцы і павышэнню кваліфікацыі кадраў. Заслугоўвае ўвагі шэраг арыгінальных методык, распрацаваных у падручніку.

Выданне названай кнігі — вялікая творчая ўдача аўтарскага калектыву. Яе адрознівае комплекснасць ізлажэння пытанняў, высокі навукова-тэарэтычны ўзровень, арыгінальная і даступная форма падачы матэрыялу. Вартасці падручніка складае абагульненне перадавога вопыту, дасягненняў эканамічнай тэорыі, улік сучасных тэндэнцый развіцця навукі і тэхнікі. Добры стыль ізлажэння, прывядзенне канкрэтных прыкладаў, табліц, формул і разлікаў, якія аблягчаюць разуменне тэарэтычных палажэнняў і вывадаў, робяць кнігу патрэбнай і карыснай не толькі для студэнтаў, але і ўсіх спецыялістаў эканамічных служб аб'яднанняў і прадпрыемстваў, жадаючых павысіць узровень сваіх ведаў у галіне навуковай арганізацыі і тэхнічнага нарміравання працы. Гэта кніга з вялікай прыхільнасцю сустрэта выкладчыкамі і аспірантамі. Яна хутка знайшла свайго чытача і ў першыя ж дні знікла з прылаўкаў кнігарань. Ва ўмовах няспыннага і надзвычай інтэнсіўнага развіцця тэорыі і практыкі, а таксама ў сувязі з абмежаваным тыражом кнігі (3500 экземпляраў), далёка не задаволіўшым попыту чытачоў, ужо ў бліжэйшыя гады патрабуецца яе перавыданне.

Пастаўленая аўтарамі задача —стварыць адзіную цэльную тэорыю навуковай арганізацыі і тэхнічнага нарміравання працы — поўнасцю дасягнута. Вучэбная літаратура папоўнілася яшчэ адным каштоўным падручнікам па эканамічнай тэорыі.

А. ЖУК,
загадчык кафедры ўліку і статыстыкі, дацэнт.

*Юрыдычная даведка*

# КАМУ АПЛОЦЯЦЬ БАЛЬНІЧНЫ ЛІСТ?

У якіх выпадках і на які тэрмін выдаецца дапамога для догляду за хворым членам сям'і? Калі дапамога па хваробе наогул не выдаецца? Гэтыя і іншыя пытанні цяпер вырашаюцца інакш.

Згодна новым правілам бальнічны ліст пры захворванні дзіцяці, узрост якога не дасягнуў 7 гадоў, выдаецца на тэрмін да 10 каляндарных дзён не толькі адзінокім маці, удовам і разведзеным жанчынам, але і выхоўваючым дзяцей разведзеным мужчынам і ўдаўцам, а таксама жонкам ваеннаслужачых тэрміновай службы. Маці, пры захворванні дзіцяці ва ўзросце да двух гадоў, дапамога выдаецца незалежна ад таго, ці ёсць іншы член сям'і, здольны даглядаць за хворым дзіцём. У выпадку захворвання дзіцяці, не дасягнуўшага 14 гадоў, дапамога выдаецца на перыяд, на працягу якога дзіцяці неабходны дogляд, але не больш чым на 7 каляндарных дзён. Разам з тым трэба мець на ўвазе, што тым, хто знаходзіцца ў водпуску (чарговым, дадатковым, часткова аплочваемым па догляду за дзіцём або без захавання заработнай платы), дапамога па догляду за захварэйшым членам сям'і, у тым ліку і за дзіцём, не выдаецца.

Дапамога па догляду за захварэўшым членам сям'і выдаецца не больш чым на 3 каляндарныя дні. Падаўжэнне тэрміну выдачы дапамогі праводзіцца толькі ў выключных выпадках у залежнасці ад ступені цяжкасці хваробы члена сям'і і бытавой абстаноўкі не больш чым да 7 каляндарных дзён.

Рабочым і служачым, якія накіроўваюцца на сельгасработы з захаваннем па асноўнаму месцу працы заработнай платы, дапамога па часовай непрацаздольнасці, наступіўшай у гэты перыяд, налічваецца з заработку, які яны мелі перад накіраваннем на ўказаныя работы, і выплочваецца на агульных падставах па асноўнаму месцу працы.

Студэнтам ВНУ, навучэнцам сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў, накіраваным на сельскагаспадарчыя работы, дапамога па часовай непрацаздольнасці налічваецца зыходзячы з атрымліваемага імі заработку.

Работніку, якому на пэўны тэрмін устаноўлена надбаўка да зарплаты, дапамога па часовай непрацаздольнасці, цяжарнасці і родах у гэты тэрмін выдаецца з улікам надбаўкі. Калі непрацаздольнасць або водпуск па цяжарнасці і родах наступілі ў момант замяшчэння часова адсутнічаючага работніка і замяшчаемаму быў устаноўлен у сувязі з гэтым больш высокі аклад, то дапамога налічваецца з больш высокага заработку, але толькі на перыяд замяшчэння.

Дапамога па часовай непрацаздольнасці не выдаецца ў наступных выпадках:

— калі часовая непрацаздольнасць наступіла ад захворванняў або траўм, атрыманых у выніку ап'янення;

— калі работнік наўмысна нанёс шкоду свайму здароўю з мэтай ухілення ад працы або прытварыўся хворым;

— калі часовая непрацаздольнасць наступіла па прычыне траўм, атрыманых пры здзяйсненні злачынстваў.

Работнікі, якія зрабілі прагул без уважлівых прычын непасрэдна перад наступленнем часовай непрацаздольнасці, парушаючыя рэжым, устаноўлены для іх урачом, пазбаўляюцца дапамогі на тэрмін, устаноўлены прафкомам установы або яго камісіяй па сацыяльнаму страхаванню.

В. РУПІН,
юрысконсульт ГДУ.

# ВАШ АДПАЧЫНАК

**Сёння:** Дэманстрацыя мадэлей сезона 1986 года. Танцавальная праграма. Актавая зала. Пачатак — 19.00.

**Заўтра:** 10—14 — масавыя спартыўныя спаборніцтвы; 14—16 — заняткі сямейнага спартклуба; 16—19 — спаборніцтвы групы «Здароўе»; 19—21 — работа секцыі па ручному мячу (падшэфныя домакіраўніцтвы).

**На наступным тыдні:** 25-га. Прэм'ера мастацкага фільма «Праверка на дарогах». (Фільм зняты па ваеннай прозе Ю. Германа. Рэжысёр — А. Герман.). Актавая зала. Пачатак — 19.30.

26-га. Дні дружбы. Вечар знаёмстваў. Актавая зала. Пачатак — 19.

27-га. Адкрыццё Дзён дружбы. Канцэрт мастацкай самадзейнасці. Танцавальная праграма. Актавая зала. Пачатак — 18.30.

28-га. Кірмаш салідарнасці. Фае 1-га вучэбнага корпуса. Пачатак — 15.30. Конкурс палітычнай песні і палітычнага плаката. Актавая зала. Пачатак — 16.30. Беларускія вячоркі. Студэнцкае кафэ. Пачатак — 20.30.

29-га. Закрыццё Дзён дружбы. Студэнцкае кафэ. Пачатак—18.00.

29-га. Спартыўны вечар. Актавая зала. Пачатак — 19. Танцавальная праграма.

# КІНО Ў ДАПАМОГУ ВЫКЛАДЧЫКУ

У лабараторыі ТСН ГДУ ёсць фільмы па філасофіі:

1. Закон адмаўлення адмаўлення. 1 ч.
2. Закон узаемнага пераходу колькасных і якасных змяненняў.
3. Закон адзінства і барацьбы процілегласцей. 1 ч.

Заяўкі падаваць у лабараторыю тэхнічных сродкаў навучання (1-ы вучэбны корпус, аўд. 1—10, 3—7).

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

Калектыў друкарска-размнажальнай лабараторыі выказвае глыбокае спачуванне машыністу рэзальных машын ДАУГАШЭЙ Веры Афанасьеўне з выпадку напаткаўшага яе горазаўчаснай смерці МУЖА.

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52. Тыраж 2000 экз.
АЗ 13097
Заказ 223.